УДК 327. 33(476)

П. В. Дзядзюля, дацэнт

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ РУХІ І АБ'ЯДНАННІ Ў ПЕРЫЯД ІСНАВАННЯ БНР

The author analyzes creation and activities of social-political movements and associations in the period of the BPR.

Гвалтоўны разгон Усебеларускага з'езда сведчыў аб непаслядоўнасці бальшавіцкай улады. 2 (15) лістапада 1917 г. Саветам Народных Камісараў была прынята «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», якая абвяшчала правы народаў на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы; адмену ўсіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў; свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і этнаграфічных груп [1]. Тым больш, што з'езд быў скліканы з дазволу і нават пры фінансавай падтрымцы ўрада.

Найбольш свядомая і дзеяздольная большасць дэлегатаў з'езда ўжо 18 снежня 1917 г. сабралася ў лакаматыўным дэпо і пад аховай чыгуначнікаў прадоўжыла работу. Была абрана Рада як паўнамоцны орган да часу склікання II Усебеларускага з'езда. 21 снежня Рада сфармавала Выканаўчы камітэт, які дзейнічаў у падполлі да 19 лютага 1918 г. З пачаткам наступлення немцаў, пасля зрыву Л. Троцкім мірных перагавораў у Брэсце, бальшавіцкая ўлада пакінула Мінск. Горад застаўся безабаронным.

20 лютага Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі і сфармаваў першы нацыянальны ўрад – Народны Сакратарыят. Аб гэтым паведамлялася 21 лютага ў першай Устаноўчай грамаце да народаў Беларусі.

3 сакавіка 1918 г. бальшавіцкі ўрад Расіі без удзелу прадстаўнікоў беларускага народа падпісаў у Брэсце мірны дагавор з Германіяй, паводле якога Расія прызнала большую частку Беларусі нямецкай здабычай. У сувязі з гэтым Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда 9 сакавіка 1918 г. прыняў другую Усебеларускую грамату, у якой абвясціў Беларусь Народнай рэспублікай. У важным дзяржаўным дакуменце фармаваліся асноўныя правы і свабоды грамадзян БНР.

18 сакавіка 1918 г. Рада Усебеларускага з'езда была пераўтворана ў Раду БНР. У яе склад былі ўключаны вядомыя дзеячы нацыянальнага руху Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі і іншыя, якія прыехалі з Вільні. 25 сакавіка 1918 г. Рада прыняла трэцюю Устаноўчую грамату, згодна якой Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай і вольнай дзяржавай.

Выданне трэцяй Устаўной граматы мела важнае значэнне для дэмакратычных пераўтварэнняў унутры дзяржавы і для міжнародных адносін. Беларуская Народная Рэспубліка набывала статус суб'екта міжнародна-прававых зносін і была прызнана ўрадамі Украінскай Народнай Рэспублікі і Літвы. У 1918–1920 гг. БНР прызналі таксама Латвія, Эстонія, Чэхаславакія, Балгарыя, Фінляндыя, Турцыя. У гэтых краінах працавалі беларускія дыпламатычныя, культурныя місіі, консульствы і прадстаўніцтвы [2].

Аднак Расія, Польшча, Літва, Латвія, Украіна разглядалі беларускія землі як нічыйныя для пашырэння сваіх межаў. Напрыклад, згодна дамовы ад 9 лютага 1918 г. між Германіяй і Украінай беларускае Палессе трапіла ў межы Украіны. У канцы сакавіка, пасля акупацыі германскімі войскамі, Гомельскі павет быў афіцыйна перададзены Украіне.

25 сакавіка ўрадам БНР была накіравана ў Кіеў спецыяльная дыпламатычная місія начале з А. Цвікевічам. Дэлегацыя пачала сумесна з украінскай камісіяй удакладняць этнічныя і гістарычныя межы між дзвюма дзяржавамі. Працэс перагавораў ішоў складана, а пасля прыходу да ўлады гетмана Скарападскага быў фактычна спынены.

Становішчам беларуска-ўкраінскай мяжы былі занепакоены жыхары Рэчыцкага і Гомельскага паветаў. Прадстаўнікі гарадоў наведалі ў маі 1918 г. Народны Сакратарыят БНР, дзе выказалі незадаволенасць уключэннем іх паветаў ва Украіну, прасілі дапамогі ў адкрыцці беларускіх школ, выкладанні беларускай мовы і беларусазнаўства ў дзеючых школах. Але наступныя падзеі не дазволілі ў той час вырашыць гэтыя пытанні [3].

17 мая 1918 г. пры Народным Сакратарыяце БНР фармуецца камісія для вызначэння межаў Беларусі з Украінай, Польшчай, Расіяй і іншымі суседнімі дзяржавамі. У яе склад былі запрошаны спецыялісты-картографы, геадэзісты, афіцэры інжынерных войск. Адначасова працавала спецыяльная група пры Народным Сакратарыяце міжнародных спраў. Яна рыхтавала падрабязную карту Беларусі паводле этнаграфічнага, гістарычнага і дзяржаўнага прынцыпаў [4].

Распацоўкай пытанняў геапалітычнага становішча і знешнепалітычнай тактыкі Беларускай рэспублікі, яе эканамічнай палітыкі, абгрунтавання дзяржаўных межаў актыўна займаўся М. В. Доўнар-Запольскі, якога падзеі 1917–1918 гг. засталі ў Кіеве. Дзякуючы яго руплівасці ў Кіеўскім універсітэце наладжва-

юцца штотыднёвыя беларускія грамадска-культурныя сходы, ствараюцца курсы беларусазнаўства пры кіеўскай вайсковай арганізацыі.

Мітрафан Віктаравіч узначальваў створаную ў канцы сакавіка 1918 г. Беларускую арганізацыю, друкаваным органам якой стала газета «Белорусское слово». Выданне мела не толькі грамадска-палітычны, культурны, ваенны накірунак, але і эканамічны, што было прэрагатывай вучонага.

У артыкулах, якія публікаваў у газеце Доўнар-Запольскі, была рэакцыя навукоўца і грамадзяніна на акупацыю Беларусі нямецкімі войскамі і падпісанне Брэсцкага міру. У гэтым ён бачыў стратэгічную небяспеку для працэсу дзяржаўнага вызначэння Беларусі – непрызнанне і тэрытарыяльныя прэтэнзіі з боку больш моцных суседзяў, што пагражала падзелам этнічнай тэрыторыі, эканамічным паслабленнем і ў перспектыве дэнацыяналізацыяй. Прычыну аўтар бачыў у спозненай і слабай палітычнай арганізацыі беларусаў і ў адставанні асэнсавання і дэкларавання нацыянальна-палітычнай праграмы.

Ён заклікаў аб'яднаць намаганні усіх суайчыннікаў як на радзіме, так і па-за яе межамі дзеля ўмацавання і падтрымкі цэнтральнай беларускай улады. Важнейшай умовай аб'яднання М. В. Доўнар-Запольскі лічыў стварэнне ўласнай універсітэцкай адукацыі, прызначэнне якой – узмацніць нацыю інтэлектуальна і сфармаваць яе эліту [5].

Пасля закрыцця Віленскага універсітэта (1832 г.), Горы-Горацкага земляробчага інстытута (1863 г.) Беларусь засталася без вышэйшай школы. І гэта ў той час, калі найперш у Еўропе ды і Расійскай імперыі, імкліва развіваліся навука, тэхніка, культура. Карэнным чынам змянялася адукацыя, узнікалі якасна новыя сярэднія, вышэйшыя навучальныя установы. Універсітэты станавіліся не толькі цэнтрамі падрыхтоўкі спецыялістаў, але і асяродкамі акумуляцыі перадавой грамадскай думкі, выпрацоўкі шляхоў фармавання нацыянальнай самасвядомасці.

Найбольш здольныя маладыя людзі, каб атрымаць адукацыю, былі вымушаны ехаць на чужбіну і пасля заканчэння вучобы не заўсёды вярталіся на радзіму. Інтэлект беларускага народа ў адказны перыяд фармавання нацыянальнай свядомасці распыляўся па ўсёй Расійскай імперыі, а то і за яе межамі.

За хутчэйшае адкрыццё універсітэта ў час Першай сусветнай вайны выступаў на старонках газеты «Дзясніца» Зміцер Жылуновіч. Паказальна, што сын рабочага-гарбара, здольны паэт у час разбою, разрухі шукаў выйсця з занядбання, цемнаты беларуса ў арганізацыі нацыянальнага універсітэта. Услед за З. Жылуновічам, М. Доўнар-Запольскім марылі пра тое ж і такія вядомыя вучоныя, выхадцы з Беларусі, як Я. Карскі, М. Янчук, У. Завітневіч і іншыя.

Пастановай Народнага Сакратарыята беларуская мова была прызнана дзяржаўнай і абавязковай мовай рэспублікі. Нацыянальным меншасцям прадастаўлялася права карыстацца сваёй мовай у афіцыйных зносінах з дзяржаўнымі ўстановамі. Усе акты, дакументы і перапіска ўрадавых устаноў выконваліся на дзяржаўнай беларускай мове [6].

Для паскарэння падрыхтоўкі настаўнікаў у Мінску 3 красавіка 1918 г. Народным Сакратарыятам асветы БНР былі адкрыты курсы беларусазнаўства. Для настаўнікаў лекцыі чыталі У. Ігнатоўскі, А. Смоліч, Т. Грыб, Я. Лёсік і іншыя. Адначасова ствараецца Бюро па напісанню і перакладанню падручнікаў на беларускую мову. Для іх выдання засноўваюцца Мінскае асветнае выдавецтва і кааператыўнае выдавецтва «Заранка». За кароткі перыяд з друкарняў выйшла 16 падручнікаў, сярод якіх «Граматыка беларускай мовы», «Гісторыя і геаграфія Беларусі», «Фізіялогія і анатомія» [7].

Пачало сваю дзейнасць Беларускае выдавецкае таварыства, а таксама выдавецтвы «Бацькаўшчына», «Крыніца». Былі надрукаваны зборнік вершаў Алеся Гаруна «Матчын дар», зборнік п'ес, нот, хрэстаматыі, матэрыялы па геаграфіі, гісторыі [8]. Засноўваюцца беларуская бібліятэка і кнігарня. Паводле розных падлікаў працавала ад 150 да 350 беларускіх школ. Сярод іх гімназіі ў Мінску, Навагрудку, Слуцку, Гродне [9].

Жаданне вучыць дзяцей абудзілася ў беларусаў з незвычайнай сілай у гэты трагічны час ваенных разбурэнняў, рэвалюцыйных навальніц. Нейкі неўсвядомлены фізічны і духоўны патэнцыял ратуе іх. Яскравым прыкладам гэтаму з'яўляецца ўзнікненне Будслаўскай беларускай гімназіі. Яе заснавалі мясцовая інтэлігенцыя і сяляне. Кіраваў будаўніцтвам дому для гімназіі архітэктар Л. Дубейнаўскі, а яе дырэктарам стаў Я. Васілевіч, вельмі адукаваны чалавек свойго часу. Пасля настаўніцкай семінарыі ён закончыў Маскоўскі археалагічны інстытут, вучыўся ў юрыдычным інстытуце. Грошы для гімназіі выдзеліў урад БНР. Ні ў бацькоў вучняў, ні ў настаўнікаў гімназіі не ўзнікла сумнення наконт мовы навучання – яна павінна быць толькі беларускаю [10].

У няпростых умовах акупацыі ўлады БНР клапаціліся пра тэатр, музычную адукацыю. У Мінску працавалі тэатральныя калектывы пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча і Ф. Аляхновіча. Арганізуецца тэатральная камісія, якая імкнулася стварыць умовы для плённай працы артыстаў, знайсці сродкі для пастаноўкі спектакляў [11].

У красавіку 1918 г. заснавана Мінская вышэйшая музычная школа, якая неўзабаве перайменавана ў Беларускую кансерваторыю. Разгортваецца культурна-асветніцкі рух. Ствараюцца самадзейныя драматычныя і харавыя гурткі, ладзяцца беларускія спектаклі і канцэрты для жыхароў мястэчак і вёсак [12].

Беларуссю цікавяцца не толькі нямецкія палітыкі, вайскоўцы, але і навукоўцы. Так, напрыклад, прафесар Берлінскага універсітэта Фрыц Куршман пасля знаёмства з сітуацыяй на Беларусі летам 1918 г. заўважыў слабасць беларускага руху, але адзначыў яго аптымістычныя перспектывы [13]. Нямецкі славіст Рудольф Абіхт разам з Янам Станкевічам напісаў дапаможнік па беларускаму правапісу і яго рэфармаванню [14].

Па ініцыятыве Івана Луцкевіча працяглы час у перыяд акупацыі Беларусі працавалі нямецкія мастацтвазнаўцы Іпель, Гайгалат, Швіндрац-гейм і Вэбер. Пры дапамозе І. Луцкевіча Іпель арганізаваў дзве выставы беларускага мастацтва – у Мінску і ў Вільні. Адначасова былі выдадзены каталогі гэтых выстаў. І. Луцкевіч друкуе ў газеце 10-й нямецкай арміі артыкул аб беларускім мастацтве. І нямецкія вучоныя публікуюць вынікі сваіх даследаванняў беларускага мастацтва ў газетах. У прыватнасці, Іпель пры наведванні Слуцка быў здзіўлены арыгінальнасцю мастацкага афармлення трох драўляных цэркваў XV ст. Адна з іх, Юраўская царква, захавала стары іканастас, рэзаны і распісаны мясцовымі мастакамі. Прыемная гармонія, надзвычайная аздоба царквы робяць яе красою ўсіх беларускіх цэркваў. Мастацтвазнаўца перакананы, што ў Слуцку можна знайсці і творы старой беларускай маляўнічай школы.

У Магілёўскім храме-музеі Іпель убачыў мноства прыгожых беларускіх старажытнасцяў і адзначыў, што ва ўсіх гэтых творах нязначны ўплыў візантыйска-расійскай школы. Вучоны ўбачыў сувязь гэтых работ з нямецкім мастацтвам, што добра перадавалася праз Балтыку. Дзве вялікія сярэбраныя плашчаніцы Магілёўскай брацкай царквы азначаюць, нават без надпісу, што беларус Ваўчок як мастак блізкі да данцыгскіх прац. Іпель у 1918 г. пісаў, што Беларусь яшчэ хавае ў сябе шмат невядомых каштоўнасцяў, якія маюць больш чым гістарычнае значэнне. Ён выказаў надзею, што пра культурныя скарбы Беларусі будуць ведаць у цывілізаваным свеце. Але гэта здарыцца тады, калі прыйдзе час для самой Беларусі. У кароткім мастацказнаўчым артыкуле Іпель выявіў гістарычныя веды пра Беларусь, са спачуваннем піша пра цяжкі лёс яе народа [15].

Абсягі дзейнасці ўраду БНР, інтэлігенцыі, сялян, рабочых у неспрыяльных гістарычных умовах сведчаць пра магутны патэнцыял нашага народа, пра яго жаданне жыць годна на зямлі, дадзенай яму богам. Ваенна-палітычныя, эканамічныя абставіны не спрыялі рэалізацыі планаў, надзей, памкненняў беларусаў.

### Літаратура


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі (ЭГБ): У 6 т. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1996. – Т. 3. – С. 337.
2. Юхо Я. Ю. Вялікая дэмакратычная агульнаеўрапейская рэвалюцыя XX ст. і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 6. – С. 5.
3. Лебедзева В. БНР і Гомельшчына // Спадчына. – 1996. – С. 67–69.
4. Мазец В. Межы БНР // Спадчына. – 1993. – № 2. – С. 107.
5. Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1994. – С. 489–492.
6. Архівы БНР. – Мн., 1998. – Т. 1. – Кн. 1. – С. 74.
7. Клубовіч А. Крокі гісторыі. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1993. – С. 51–52.
8. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка г. Мінска. – Мн., 2002. – Кн. 2. – С. 302.
9. ЭГБ: У 6 т. – Мн., 1993. – Т. 1. – С. 385.
10. Жук-Ґрышкевіч Р. Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча. – Таронто, 1993. – С. 9–11.
11. Шыманец В. Калі тэатр ставіць пытанні палітычнай і культурнай гісторыі Беларусі // Запісы інстытута навукі і мастацтва. – Н'ю-Йорк; Мінск – 2003. – С. 14–16.
12. ЭГБ: У 6 т. – Мн., 1993. – Т.1 – С. 386.
13. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мн.: Беларусь. – С. 23.
14. Запрудскі С. Неюбілейныя думкі з нагоды юбілейных выданняў мовазнаўчай спадчыны // Беларускі гістарычны агляд. – Мн., 2003. – Т. 10. – Сшыткі 1–2. – С. 330.
15. Іпель А. Беларускае мастацтва // Спадчына. – № 3. – С. 276–277.